З КАГОРТЫ САВЕЦКІХ СОКАЛАЎ

Яго часта бачылі ў аэраклубе. Пасля працоўнага дня ён прыходзіў сюды і займаўся разам з юнакамі і дзяўчатамі.

І — лятаў. Любы лётчык вызначыў бы, што за штурвал вучэбнага самалёта садзіцца «чалавек неба».

Аднойчы ён прыйшоў на заняткі ў аэраклуб у добра адпрасаваным касцюме, з намерам выступіць перад моладдзю. На грудзях яго над двума радамі ордэнаў і медалёў зіхацела Залатая Зорка Героя Савецкага Саюза.

Так пасляваенныя аэраклубаўцы даведаліся, што з імі «ў адным небе» лятае праслаўлены лётчык Іван Іларыёнавіч Камінскі. Яны глядзелі на Залатую Зорку і здзіўлена пыталіся ў Героя, навошта яму, які столькі лятаў на баявых машынах, столькі бачыў і перажыў, важдацца з матчасткай і падымацца ў неба на вучэбных ціхаходах...

— Люблю лятаць,— усміхаючыся, адказаў Камінскі,— а ўрачы пасля ранення забаранілі служыць у авіяцыі.

...Даўно гэта было, калі ён лятаў на вучэбных аэрапланах,— у 1939 годзе. Тады на ўсю краіну прагучаў заклік: «Камсамол — на самалёт!» У тым, што адным з першых адгукнуўся на яго Камінскі, не было выпадковасці.

...Хлапчуком, вучнем чацвёртага класа, упершыню ўбачыў ён над сваёй роднай вёскай самалёт.

— Хто гэта лятае? — спытаў ён настаўніцу.

— Лётчык.

Быццам неба расхінулася над галавой хлапчука! Бо там, у сіняй вышыні, так блізка да аблокаў, да сонца, кіруе гэтай штучнай птушкай чалавек.

Так з'явілася мара быць лётчыкам. Камінскі ўсё падпарадкаваў ёй: ён выдатна вучыўся, упарта займаўся фізкультурай, чытаў пра авіяцыю і лётчыкаў усё, што мог дастаць. Пасля школы Іван Камінскі паехаў у Віцебск. Ён ужо ведаў, што там ёсць аэраклуб, але трапіць туды вельмі цяжка: вялікі конкурс. Камінскі прымае рашэнне: каб не марнаваць час, паступіць на педрабфак і паспрабаваць прайсці конкурс у аэраклуб. Калі атрымаецца — займацца і там, і тут. Паступіў — і стаў лятаць! Днём вучыўся



І. І. Камінскі, 1974 г.

прафесіі педагога, а вечарамі і ў выхадныя дні — майстэрству лятаць. О, які гэта быў час, што адчуваў Іван Камінскі, калі яго маленькі самалёцік адрываўся ад зялёнага аэраклубаўскага поля!

Мара стала жыццём. Мара выросла да неба — і працягвала жыць. Вось тады і прагучаў заклік ЦК ВЛКСМ: «Камсамол — на самалёт!»

Камінскі паступае ў ваеннае вучылішча ў горадзе Энгельсе. Часта ў вольны час сядзелі Іван і яго таварышы на беразе Волгі.

— Прыгожа, Ваня?

— Дзіва што... Волга ж усё-

І. І. Камінскі (справа) з французскім лётчыкам Марселем Альберам, 1944 г.



такі... Але... Вось, калі вы прыедзеце да мяне ў госці на Віцебшчыну...

— Зараз зноў пачне пра лясы, азёры і грыбы! Пра што б ні казалі: «Мая Беларусь!»

— А вы прыязджайце, пабачыце.

— Прыедзем! Абавязкова прыедзем!

Не ведалі будучыя ваенныя лётчыкі, што многія з іх не змогуць ажыццявіць свае планы, што загінуць яны пры абароне Радзімы, а тыя, хто застанецца жыць, убачаць Беларусь толькі ў 1944 годзе. Здратаваную, зруйнаваную, спаленую — вось такую ўбачыць сваю радзіму Іван Камінскі.

А пакуль — ідзе 1941 год, і маладыя хлопцы вучацца лятаць на бамбардзіроўшчыках, і кожны раз, калі яны выляталі і садзіліся на свой аэрадром, пад крылом іх самалётаў велічна праплывала Волга.

Пачатак вайны лётчык І. Камінскі сустрэў у часці асобнага прызначэння — у палку далёкай авіяразведкі. У гэты полк накіроўваліся лепшыя пілоты. Тут лік ішоў не на збітыя самалёты, а на знішчаныя наземныя аб'екты. Не шукаць праціўніка ў паветры, а пазбягаць сустрэчы з ім — вось першая запаведзь паветранага разведчыка. Ён павінен быў знайсці зададзены аб'ект, квадрат, мясцовасць — сфатаграфаваць і даставіць плёнку камандаванню. Такі пілот павінен мець высокую кваліфікацыю, павінен быць не толькі майстрам аэрафотаздымкі, але і майстрам супрацьзенітнага манеўру, а таксама ўмелым паветраным байцом на выпадак нападзення варожых знішчальнікаў. Вытрымка, смеласць, дакладнасць, сумленнасць...— без гэтых якасцей няма пілота-разведчыка.

Камінскі шмат і ўпарта трэніраваўся, увесь вольны час аддаваў авалодванню тонкасцямі сваёй нялёгкай воінскай прафесіі. Упартасць і настойлівасць маладога лётчыка былі ўзнагароджаны. Ужо першыя палёты далі вынікі: па даных аэрафотаздымкі, зробленай яго экіпажам, былі знішчаны варожы аэрадром і склад боепрыпасаў. Перад строем палка гучаць словы:

— За ўзорнае выкананне баявых заданняў і праяўленую пры гэтым мужнасць... малодшы лейтэнант Камінскі...



І. І. Камінскі з баявым экіпажам, 1944 г.

Палёты, палёты... Яшчэ склад, мост, калона варожых танкаў... За яго самалётам-разведчыкам пачынаецца паляванне. Безліч разоў адрываўся ён ад ворага, падманваў гітлераўскіх зенітчыкаў. У яго лётнай кніжцы запісана ўжо больш як семдзесят баявых вылетаў.

У канцы верасня 1942 года экіпаж Камінскага вылецеў на выкананне задання ў раёне гарадоў Арла і Болхава. І тут варожы зенітны снарад трапіў у правы матор. Самалёт загарэўся. З цяжкасцю дацягнуў пілот да сваіх і ў суцэльным тумане ўсё ж пасадзіў падбітую машыну.

— Дазвольце вылецець на другім самалёце і выканаць заданне,— звярнуўся Камінскі да камандзіра палка.

— Можа, адпачнеце? — спытаў камандзір.

— Пасля палёту.

— Як штурман і стралок?

— Я прашу ад імя экіпажа...

Заданне было выканана. Выкарыстоўваючы схему дарог у варожым тыле, камандаванне кінула ў прарыў значныя сілы войск і тэхнікі, захаваўшы жыццё тысячам нашых салдат.

18 красавіка 1943 года загад: «За смелыя і ўмелыя дзеянні пры разведцы войск праціўніка і праяўленыя пры гэтым мужнасць і гераізм узнагародзіць ордэнам Айчыннай Вайны І ступені пілота асобнага разведвальнага палка І. І. Камінскага». Трэці ордэн упрыгожыў грудзі лётчыка.

А па начах снілася яму Віцебшчына, родная вёска, рэчка... Прачынаўся, ляжаў з расплюшчанымі вачамі: як там мама, родныя, блізкія? Столькі часу ў акупацыі... Ці жывыя?

Ён убачыў, нарэшце, Беларусь — з зашклёнай кабіны свайго самалёта. Унізе ляжала спустошаная зямля. Скрозь слёзы глядзеў ён на суцэльныя руіны Мінска, Оршы, Віцебска... І — фатаграфаваў — здымаў, здымаў, здымаў тысячы квадратных кіламетраў варожай абароны, дзесяткі ваенных аб'ектаў. Здымаў, як страляў.

Сваёй работай ён ратаваў жыцці, паскараў вызваленне роднай зямлі ад фашыстаў.

Яго экіпаж гітлераўскае камандаванне прыраўнівала да цэлага пяхотнага палка. Пра гэта гаварылі збітыя і ўзятыя ў палон нямецкія лётчыкі. Яны ведалі прозвішча савецкага аса-разведчыка: «За Камінскага нам абяцалі жалезны крыж». А Камінскі, за якім увесь час палявалі, лятаў і лятаў над тылам ворага, і кожны палёт быў роўны подзвігу. Вялікі быў асабісты ўклад пілота і ў паспяховую падрыхтоўку адной з буйнейшых аперацый Вялікай Айчыннай вайны — аперацыі «Баграціён».

Аднойчы раніцай Іван Іларыёнавіч пачуў у зводцы Саўінфармбюро: «...вызвалены буйны абласны цэнтр Беларусі горад Віцебск!..»

Ён пайшоў на край лётнага поля і некаторы час прабыў там у адзіноце. Вызвалены Віцебск... Значыць, свабодная і яго родная вёска Мяккія...

Ён прыляцеў на «кукурузніку» — «У-2» — да роднай вёскі. Пад крылом Мяккія... А вось і яго, Іванава, хата! З агарода да дома бягуць жанчына і дзяўчынка... А гэта, пасярод агарода, глядзіць з-пад рукі на самалёт... Мама!

Самалёт кружыць і кружыць, пралятаючы нізка над хатай, і не ведае старшы лейтэнант, што вусны старой жанчыны шэпчуць:

— Ваня... Гэта Ваня...

— Мама! — крычыць Іван.— Мама!

На маленькім чырвоным парашуце ён выкідвае сігнальную капсулу. Жанчына падбірае яе і вымае запіску, чытае: «Мама! Хутка буду ў вас. Твой Іван».

Маці прыкладвае рукі да грудзей і падымае мокры ад слёз твар да самалёта, да неба,— да сына!

— Ваня!

Праз два дні Іван Камінскі прыехаў да маці...

Гэты эпізод не выдуманы. Праз сорак адзін год яго расказала нам сястра Героя Еўдакія Іларыёнаўна: «Цэлыя суткі прабыў Ваня дома... Такая радасць была, такая радасць! Мы ж не ведалі пра яго зусім нічога... І ён пра нас таксама нічога не ведаў... Цэлыя суткі — як хвіліна...»

Вайна працягвалася. Пад магутнымі ўдарамі Савецкай Арміі фашысцкія дывізіі адкочваліся на Захад. Старшы лейтэнант Камінскі пілатаваў свой самалёт у небе Літвы, Латвіі, Польшчы. Армія, у якую ўваходзіў полк Івана Іларыёнавіча, рыхтавалася да выступлення «ў лоб».

— Бачыў буйную групоўку войск: мотапехота, танкі, артылерыя. Вось тут...— дакладвае лётчык.

— Колькасць?

— Да дзвюх дывізій. Флангі адкрыты.

Звесткі паветранай разведкі дакладваюць камандуючаму арміяй. І той, склікаўшы камандзіраў, прымае новае рашэнне. Армія «абцякае» групоўку з флангаў, акружае яе і зні-

Сустрэча на французскай зямлі.





Бюст Героя Савецкага Саюза І. І. Камінскага, устаноўлены ля Машканскай СШ Сенненскага раёна. Работа настаўніка В. А. Цішкевіча.

шчае. Камандуючы выклікаў Камінскага:

— Вось ты які... Дай абдыму!.. Дзякуй табе і тваім хлопцам.

«...У выніку нашы войскі пазбеглі вялікіх страт у жывой сіле і тэхніцы»,— так было сказана ў прадстаўленні да чарговай узнагароды капітана Камінскага.

...27 лютага 1945 года самалёт Камінскага вяртаўся з задання. Два «фоке-вульфы» з'явіліся нечакана. Аднаго ўдалося збіць, другі падпаліў чырвазорную машыну. Дацягнуўшы да сваіх, цяжка паранены камандзір загадаў штурману і стралку-радысту «пакінуць борт». Убачыўшы ў небе два парашуты, Камінскі, ужо ў палаючым камбінезоне, выкінуўся з самалёта, які праз некалькі імгненняў узарваўся ў паветры.

Гэта быў апошні, 239-ы, баявы вылет лётчыка-разведчыка Івана Камінскага. Ён страціў прытомнасць і яго даставілі ў шпіталь. Больш як год правёў там Іван Іларыёнавіч. Урачы літаральна вырвалі яго ў смерці. Там, у шпіталі, Камінскі сустрэў Перамогу. Там 29 чэрвеня 1945 года ўсе «хадзячыя» і ўсе ўрачы павіншавалі лётчыка са званнем Героя Савецкага Саюза.

— Колькі вы збілі самалётаў? — спытаў у яго карэспандэнт ваеннай газеты.

— Ніводнага. Збіваў стралок-радыст, ды і то нямнога.

— А вы бамбілі?

— Ніводнай бомбы не скінуў.

— Што ж вы рабілі?

— Я фатаграфаваў,— усміхнуўся Камінскі.

Дваццаць сем тысяч квадратных кіламетраў варожай абароны, умацаваных раёнаў, перадавой лініі зняў з паветра Герой Савецкага Саюза Іван Камінскі. Гэта быў своеасаблівы рэкорд. Так яго ніхто і не пабіў.

Залатую Зорку Іван Іларыёнавіч атрымаў вясной 1946 года, пасля таго, як выпісаўся са шпіталю.

...Ён ішоў па вуліцах Мінска і з прытоеным сумам глядзеў у неба, дзе куляўся маленькі вучэбны самалёцік... «А што, калі паспрабаваць?» — з надзеяй падумаў былы пілот.

На медыцынскай камісіі Герою сказалі:

— Лятаць вам больш не давядзецца.

Так вайна ўкрала ў Камінскага яго мару — неба.

Але спраў хапала і на зямлі. Камуніста Камінскага накіравалі ў партыйную школу. Скончыўшы яе, ён працаваў у апараце Савета Міністраў Беларусі. І ніхто не ведаў, што адказны работнік Дзяржкантролю рэспублікі наведвае Мінскі аэраклуб і са светлым, натхнёным выразам твару адрывае ад зямлі маленькі вучэбны самалёцік...

Да сонца, да мары!

...Ён працаваў сакратаром райкома партыі, старшынёй Фрунзенскага райвыканкома Мінска, потым у апараце Дзяржплана БССР... Даўно ўжо не лятаў. Але ўсе, хто яго ведаў і хто не ведаў, бачылі, што гэта чалавек Мары. Дарма, што ўжо даўно хадзіў па зямлі — высокая душа была ў гэтага чалавека.

В. ВІННІЦКІ.